ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 37 (209) | Субота, 14 снежня 1974 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ДА ЗІМОВАЙ СЕСІІ — 22 ДНІ



**Уладзімір Арцянкоў, якога вы бачыце на гэтым здымку, вучыцца на чацвёртым курсе эканамічнага факультэта. Гэта — адзін з лепшых студэнтаў: у яго залікоўцы амаль адны выдатныя адзнакі. Цяпер Уладзімір узначальвае студэнцкае навуковае таварыства факультэта. Аказанае давер'е ён стараецца апраўдаць не толькі актыўным удзелам у выкананні навукова-даследчых работ, але і выдатнымі ведамі, якія трэба паказваць на экзаменацыйных сесіях.**

**На здымку: Уладзімір Арцянкоў за выбарам патрэбнай літаратуры для падрыхтоўкі да надыходзячай зімовай сесіі.**

## ЗА АЎТАРЫТЭТ УНІВЕРСІТЭТА

Вось-вось пачнецца самая гарачая пара для студэнтаў —зімовая залікова-экзаменацыйная сесія. У душы кожнага пануе няўпэўненасць — няхай ты першакурснік ці выпускнік. На сесіі прадстаіць даведацца пра адзнаку сваіх ведаў, падвесці вынік вучэбнага семестра. І таму цяпер кожнага студэнта можна часцей бачыць у чытальнай зале або ў бібліятэцы. Усе яны ліквідуюць прабелы ў набываемых ведах.

Прыкладам зараз могуць служыць і студэнты геалагічнага факультэта, якія звыш расклада падоўгу заседжваюцца ў аўдыторыі мінералогіі і петраграфіі, паўтараюць пройдзены матэрыял.

І так не толькі на адным факультэце. Увесь універсітэт жыве адным дыханнем. Ад таго, як мы аднясемся ў падрыхтоўчы перыяд да засваення вучэбнай праграмы, залежаць вынікі экзаменаў.

З вялікай заклапочанасцю да зімовай сесіі рыхтуюся і я асабіста. Па ліку яна будзе ў мяне пятай. Усе папярэднія вытрымаў паспяхова. На прадстаячай сесіі імкнуся дабіцца самай высокай паспяховасці за ўсе гады вучобы. Хацелася б, каб такую мэту паставіў перад сабой кожны студэнт. Высокімі якаснымі ведамі мы будзем падымаць аўтарытэт свайго універсітэта.

**У. СУСОЛКІН,**
**студэнт 3-га курса геалагічнага факультэта.**



**Што ні дзень — усё больш і больш наведвальнікаў у чытальнай зале бібліятэкі ўніверсітэта. Гэта сведчыць аб надыходзячых экзаменах. Большасць студэнтаў даражыць цяпер кожнай гадзінай, каб папоўніць свае веды.**

**На здымку: у чытальнай зале.** Фота **А. Рудчанкі.**

## ЯШЧЭ АДЗІН УНІВЕРСІТЭТ

Да 61 універсітэта краіны прыбавіцца яшчэ адзін. Прынята рашэнне аб стварэнні ўніверсітэта ў Чэлябінску. Ён размесціцца на беразе ракі Леіяс. Універсітэт стане буйным навуковым і культурным цэнтрам сталіцы індустрыяльнага Паўднёвага Урала.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

## «САЮЗ-16»: ПАЛЁТ ЗАВЕРШАН

8 снежня 1974 года пасля паспяховага завяршэння праграмы работ на борце карабля «Саюз-16» касманаўты таварышы Анатоль Васільевіч Філіпчанка і Мікалай Мікалаевіч Рукавішнікаў вярнуліся на зямлю.

У ходзе шасцісутачнага арбітальнага палёту праведзены запланаваныя выпрабаванні новага стыковачнага агрэгата і яго аўтаматыкі, сістэм арыентацыі, кіравання рухам і жыццезабеспячэння, мадэрнізаваных у адпаведнасці з патрабаваннямі маючага адбыцца ў 1975 годзе савецка-амерыканскага эксперыменту па стыкоўцы касмічных караблёў «Саюз» і «Апалон». Пры выкананні манеўравання, арыентацыі і стабілізацыі карабля «Саюз-16» адпрацоўваліся дзеянні і рэжымы работы экіпажа пры вырашэнні задач, ідэнтычных задачам будучага сумеснага палёту.

Згодна з намечанай праграмай касманаўты А. В. Філіпчанка і М. М. Рукавішнікаў выконвалі навуковыя і навукова-тэхнічныя даследаванні, фатаграфавалі розныя ўчасткі тэрыторыі Савецкага Саюза ў інтарэсах народнай гаспадаркі.

На ўсіх этапах палёту, які праходзіў ва ўмовах, максімальна набліжаных да ўмоў маючага адбыцца касмічнага эксперыменту, сістэмы карабля «Саюз-16» і ўстаноўленая на яго борце апаратура працавалі нармальна.

Вынікі навуковых эксперыментаў, атрыманыя ў ходзе палёту, апрацоўваюцца і вывучаюцца.

* * *

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 11 снежня 1974 года за паспяховае ажыццяўленне арбітальнага палёту на касмічным караблі «Саюз-16» і праяўленыя пры гэтым геразім і мужнасць лётчыкі-касманаўты СССР Героі Савецкага Саюза А. В. Філіпчанка і М. М. Рукавішнікаў узнагароджаны ордэнамі Леніна і другімі медалямі «Залатая Зорка».

У азнаменаванне подзвігу на радзіме герояў будуць устаноўлены бронзавыя бюсты.

## УЗНАГАРОДЫ—ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

Трэцяга снежня ў Палацы чыгуначнікаў імя У. І. Леніна адбыўся абласны сход удзельнікаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. На злёце прысутнічала каля 400 камандзіраў, камісараў і байцоў СБА нашага ўніверсітэта. Яны былі сведкамі таго, як пад бурныя апладысменты атрадам «Універсал» імя Героя Савецкага Саюза Аляксандра Ісачанкі і «Прамень» з ГДУ ўручылі пераходныя Чырвоныя сцягі за высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве. Начальнік штаба працоўных спраў нашага ўніверсітэта Уладзімір Дзюбо атрымаў грамату абкома КПБ. Ганаровых грамат ЦК ВЛКСМ удастоіліся студэнт факультэта фізічнага выхавання, камандзір атрада «Прамен» Іван Масло, студэнтка біёлага-глебавага факультэта, камандзір атрада «Біёлаг» Варвара Сапега, студэнт механіка-матэматычнага факультэта, камандзір атрада «Іскра» Аляксандр Новікаў і студэнтка эканамічнага факультэта, камандзір атрада «Гамяльчанка» Валянціна Скурлова.

Група байцоў СБА ўзнагароджана каштоўнымі падарункамі і прэміямі.

(Справаздачу аб злёце чытайце на 2-ой стар.).

## У ЭКСПЕДЫЦЫІ «МАЯ РАДЗІМА—СССР»

Абласны камітэт камсамола даў старт другому этапу Усесаюзнай экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР». У ёй прынялі ўдзел каля трыццаці лепшых прадстаўнікоў моладзі Гомеля, у тым ліку паэт аспірант кафедры беларускай літаратуры ГДУ Віктар Ярац, студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Міла Беразоўская і Сямён Шыкун.

Свой шлях члены экспедыцыі пачалі з плошчы Працы ад Вечнага агню. Яны ўдзельнічалі ў рабоце абласнога злёту членаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Далейшы іх маршрут прайшоў праз Буда-Кашалёў-Рэчыцу-Калінкавічы-Мазыр і быў звязаны з месцамі баявой і працоўнай славы савецкага народа.

## АБ ІДЭАЛАГІЧНЫМ ВЫХАВАННІ СТУДЭНТАЎ

У канцы мінулага месяца на эканамічным факультэце адбыўся адкрыты партыйны сход. Камуністы, камсамольскі актыў, выкладчык абмяркоўвалі задачы ідэалагічнага выхавання студэнцтва ў вышэйшай школе. Было адзначана, што важнейшая роля ў фармаванні марксісцкага светапогляду ў будучых спецыялістаў належыць грамадскім навукам, выкладанню якіх ва ўніверсітэце павінна ўдзяляцца не менш увагі, чым спецыяльным прадметам.

Аб задачах, якія ставяцца перад выкладчыкамі грамадскіх навук, гаварыў у сваім дакладзе доктар эканамічных навук М. І. Рубцоў.

Пра значэнне камуністычнага выхавання ў вышэйшай школе гаварылі ў сваіх выступленнях выкладчыкі М. Н. Мурашка, І. І. Цімашэнка, студэнты-камуністы.

Сход прыняў пастанову, якая абавязвае павысіць патрабаванні да выкладання грамадскіх дысцыплін, палепшыць інтэрнацыянальную і палітыка-выхаваўчую работу ў вучэбных групах і інтэрнатах. Неабходна на вышэйшы ўзровень узняць работу школы «Маладога лектара», ажывіць дзейнасць клуба «Малады эканаміст».

**У. ПАШУК,**
**выкладчык кафедры галіновых эканомік.**

## ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЦЯ

● У мінулую сераду агітбрыгада факультэта фізічнага выхавання выязджала ў Хойнікі. Выкладчыкі М. А. Кульбякоў і І. Р. Трафімовіч прынялі ўдзел у практычных занятках выкладчыкаў фізічнай культуры школ раёна па методыцы правядзення школьнага ўрока па фізічнай падрыхтоўцы, далі шмат карысных парад.

У райцэнтры адбыўся спартыўны вечар моладзі, на якім лепшыя спартсмены факультэта выступілі з паказальнымі нумарамі, а аматары мастацкай самадзейнасці — з канцэртам.

● Адбыліся чарговыя заняткі раённай школы прапагандыстаў у Чачэрску. Перад яе слухачамі з лекцыямі выступілі выкладчыкі кафедры палітэканоміі ГДУ кандыдат эканамічных навук У. С. Дайнека і А. П. Смоліна.

● Савет СНТ універсітэта аб'явіў агляд-конкурс рацыяналізатарскіх прапаноў, накіраваных на паляпшэнне або на распрацоўку канструкцый лабараторных установак (вучэбных і навуковых), прыстасаванняў, стэндаў, макетаў і г. д.

У конкурсе маюць права прыняць удзел выкладчыкі, аспіранты, лабаранты, студэнты. Яго вынікі будуць падведзены ў красавіку 1975 года.

● Вечар «Фізічная культура і здароўе» праведзены ў актавай зале ўніверсітэта студсаветам інтэрната № 3. Перад моладдзю выступалі медыкі, выкладчыкі фізічнай культуры, спартсмены. На пераканаўчых прыкладах яны адзначалі вялікае значэнне фізічнай культуры для загартоўкі чалавека, пазбаўлення ад слабасці, хвароб.

● За апошні час для жыхароў інтэрната № 2 была прачытана лекцыя аб культуры мовы, з якой выступіла дацэнт кафедры рускай і беларускай моў Т. С. Янкова, а інтэрната № 1 — лекцыя аб міжнародным становішчы.

● Больш 600 студэнтаў універсітэта паглядзелі ў Гомельскім рускім абласным драматычным тэатры спектакль «З каханнем не жартуюць». Культпаход быў арганізаваны прафкомам і клубам мастацкай самадзейнасці.

● 17 снежня на эканамічным факультэце пачне работу традыцыйная 4-я навуковая студэнцкая канферэнцыя. Яе ўдзельнікамі будуць студэнты з Літвы, Украіны, сталіцы нашай рэспублікі і іншых гарадоў.

«Радзіма, партыя вераць у маладое пакаленне, і жыццё паказала: у любой справе на камсамол можна смела спадзявацца!».

(З прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева на XVII з'ездзе ВЛКСМ).

# СЕМЕСТР ПРАЦОЎНАЙ ЗАГАРТОЎКІ

## З АБЛАСНОГА ЗЛЁТУ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ

У тым, што студэнцкі будаўнічы атрад «Універсал» з Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта выканае дагавор на ўзвядзенне механізаванай майстэрні ў калгасе імя Ульянава Буда-Кашалёўскага раёна, шчыра кажучы, вельмі сумняваліся і кіраўнікі раённай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі, і праўленне гаспадаркі. Па графіку аб'ект павінен будавацца пяць месяцаў, студэнты ж абавязаліся зрабіць усё за 35 дзён. Атрад працаваў па метаду Героя Сацыялістычнай Працы М. Злобіна. У дні працоўнага семестра было ўсё: і салёныя кропелькі поту, і самаадданасць кожнага, і сяброўская ўзаемавыручка. Маладыя будаўнікі перамаглі: аб'ект здадзен з добрай якасцю нават раней тэрміну на 5 дзён.

Акрамя таго, байцы «Універсала» прачыталі 13 лекцый, агітбрыгада выступіла з пяццю канцэртамі, у выхадныя дні праведзен бягучы рамонт мясцовай школы, вучням перададзена бібліятэчка, афармлены два стэнды.

...І ўзарвалася апладысментамі зала Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна, калі камандзір абласнога будаўнічага атрада **Міхаіл Кручкоў** павіншаваў байцоў атрада «Універсал» і яго камандзіра **Уладзіміра Басака** з прысуджэннем першага месца ў сацыялістычным спаборніцтве сярод атрадаў вобласці.

Лепшыя з лепшых — прадстаўнікі двухтысячнай арміі членаў студэнцкіх будаўнічых атрадаў сабраліся тут на свой падагульняючы злёт. З вялікай увагай быў праслухан даклад другога сакратара Гомельскага абкома партыі **Ф. А. Цэхановіча,** які ад імя абласнога камітэта партыі павіншаваў удзельнікаў злёту з паспяховым завяршэннем працоўнага семестра.

Затым выступілі сакратар камітэта камсамола Гомельскага філіяла БПІ, камандзір атрада «Подзвіг» **Яўген Маляранка**, камандзір атрада «Дружба» Гомельскага ўніверсітэта **Міхаіл Ермаліцкі,** навучэнка Гомельскага сельскагаспадарчага тэхнікума, камісар атрада «Колас» **Зінаіда Лапіцкая**, першы сакратар Гомельскага абкома камсамола **Уладзімір Шаплыка,** камандзір рэспубліканскага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў **Руслан Машкоўскі,** камандзір абласнога студэнцкага будаўнічага атрада **Міхаіл Кручкоў** і іншыя.

Было аб чым рапартаваць удзельнікам працоўнага семестра 1974 года, які прайшоў пад дэвізам: «50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна — 50 ударных дзён». Студэнты з Гомельшчыны працавалі на будаўнічых аб'ектах Гомельскай, Уральскай, Томскай абласцей, Малдаўскай ССР і братняй Чэхаславакіі. Толькі ў Гомельскай вобласці асвоена 4 мільёны 65 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, вытворчая праграма выканана на 114,5 працэнта. Гэта важкі ўклад студэнцкага камсамола ў фонд вызначальнага года дзявятай пяцігодкі. Праца байцоў абласнога атрада ацэнена высока: атрад прызначан адным з лепшых у рэспубліцы — заняў другое месца сярод абласных студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Выдатных паказчыкаў як у вытворчай, так і ў грамадска-палітычнай рабоце дабіліся сёлета таксама многія атрады, у тым ліку: «Прамень», «Эканаміст» Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Галоўнымі аб'ектамі прыкладання сіл байцоў студэнцкіх атрадаў былі ўдарныя камсамольскія будоўлі: Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, меліярацыя беларускага Палесся, а таксама легендарная Рудабелка. Сіламі 250 баўцоў на будаўніцтве Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода асвоена 387 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Лектары будаўнічых атрадаў прачыталі 544 лекцыі па матэрыялах XXIV з'езда КПСС, XVII з'езда ВЛКСМ, XXV з'езда камсамола рэспублікі, па гісторыі ленінскага камсамола, аб гераічнай барацьбе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Калектывы мастацкай самадзейнасці атрадаў далі для мясцовага насельніцтва 379 канцэртаў.

Да новага навучальнага года адрамантавана 49 школ, пабудавана 123 спартыўныя пляцоўкі, абсталявана 38 вучэбных кабінетаў і фоталабараторый. Пры атрадах працавалі 54 кансультацыйныя пункты па падрыхтоўцы сельскай моладзі да паступлення ў навучальныя ўстановы, дзе займалася 282 чалавекі. Байцы студэнцкіх атрадаў арганізавалі работу 24 піянерскіх лагераў-спадарожнікаў.

Адной з самых цудоўных асаблівасцей трэцяга семестра з'яўляецца ваенна-патрыятычная работа. У 32 атрады вобласці былі залічаны ганаровымі байцамі Героі Савецкага Саюза — нашы землякі. Грошы, зароблены на іх імя, пералічваліся ў савецкі фонд міру. Абласны студэнцкі атрад заваяваў права насіць імя Героя Савецкага Саюза Аляксандра Ісачанкі.

Байцы будатрадаў прынялі актыўны ўдзел у аперацыі «Абавязак» па аказанню шэфскай дапамогі ветэранам вайны і працы.

Вялікая дапамога была аказана гаспадаркам вобласці і ў час нарыхтоўкі кармоў, жніва.

І ўсё ж, як адзначалася ў дакладзе і ў выступленнях удзельнікаў злёту, у час працоўнага семестра не абышлося без асобных промахаў і недагляданў. У асобных атрадах Гомельскага ўніверсітэта і БІЧТу назіраліся выпадкі недастатковай увагі да палітыка-выхаваўчай работы. На жаль, мелі месца парушэнні статута Усесаюзнага ЄБА, пасля чаго асобных таварышаў даводзілася адлічваць з атрадаў.

Ліквідаваць недахопы, аб якіх ішла размова на злёце, — значыць яшчэ вышэй узняць ролю працоўнага семестра.

Удзельнікаў злёту горача віталі юныя піянеры і прадстаўнікі Усесаюзнай экспедыцыі савецкай моладзі «Мая Радзіма — СССР».

Аднадушна быў прыняты Зварот удзельнікаў злёту да байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў 1975 года.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці і студэнцкі баль.



Нядаўна госцем эканамічнага факультэта быў доктар эканамічных навук, прафесар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС С. С. Дзарасаў. Відны вучоны з Масквы выступіў на метадалагічным і тэарэтычным семінары выкладчыкаў факультэта.

На здымку: перад удзельнікамі семінара выступае прафесар С. С. Дзарасаў.

Фота М. ДАЛГІХ, студэнта 3-га курса эканамічнага факультэта.

АГЛЯД-КОНКУРС: НАВУКА — ВЫТВОРЧАСЦІ

# ЗА ДАЎГАВЕЧНАСЦЬ АБСТАЛЯВАННЯ

Калектыў навукова-педагагічных супрацоўнікаў нашага ўніверсітэта і пярвічная арганізацыя НТТ «Машпром» актыўна ўключыліся ў конкурс на лепшую навукова-вытворчую распрацоўку, выкананую сумесна работнікамі навуковых устаноў і прадпрыемстваў г. Гомеля.

Рашэннем Савета пярвічнай арганізацыі НТТ «Машпром» на конкурс вылучана тэма: «Распрацоўка метадаў павышэння даўгавечнасці нафтаздабываючага і нафтапрамысловага абсталявання шляхам прымянення антыфрыкцыйных матэрыялаў на аснове тэрмарэактыўных смол», выконваемую кафедрай механікі па заказу нафтагазаздабываючага аб'яднання «Беларусьнафта». Асноўныя распрацоўкі выконваюцца навуковым кіраўніком тэмы кандыдатам тэхнічных навук, дацэнтам В. П. Стаўровым, старшым выкладчыкам М. У. Акулічам і аспірантам В. І. Ціценком.

Неабходнасць выканання тэмы абумоўлена шэрагам вытворчых і тэхнічных умоў. Справа ў тым, што наяўнасць у здабываемай нафце механічных прымесей, пластавых вод і агрэсіўных газаў, а таксама розныя хімічныя агенты, выкарыстоўваемыя для апрацоўкі свідравін, рэзка павышаюць знос нафтавага абсталявання. Акрамя таго, наяўны ў нафце парафін, асядаючы на сценках труб па меры зніжэння тэмпературы, памяншае дэбет свідравіны і выклікае неабходнасць перыядычнай ачысткі помпава-кампрэсарных труб, што павышае сабекошт здабываемай нафты.

У выніку праведзеных даследаванняў распрацаваны палімерныя пакрыцці нафтапрамысловага абсталявання, якія дазваляюць значна паменшыць яго каразійна-механічны знос і асяданне парафіну ў свідравінах. Акрамя таго, яны могуць працаваць ва ўмовах сухога трэння і дапускаюць змазку вадой, што дазваляе замяніць падшыпнікавыя матэрыялы ў вузлах трэння з каляровых сплаваў на палімерныя.

Прымяненне распрацаваных матэрыялаў ва ўмовах аб'яднання «Беларусьнафта» дазволіць практычна ліквідаваць затраты на ачыстку свідравін ад парафіну, што знізіць сабекошт здабываемай нафты больш чым на адзін працэнт. Замена падшыпнікавых матэрыялаў у вузлах трэння помп і іншага абсталявання рэзка павысіць іх даўгавечнасць і знізіць затраты на рамонтныя работы.

Цяпер ажыццяўляецца ўкараненне названых матэрыялаў на прадпрыемствах аб'яднання. Да канца гэтага года будзе падлічаны фактычны эканамічны эфект, атрыманы сёлета, а таксама чакаемы ў 1975 годзе.

Варта зазначыць, што распрацаваныя антыфрыкцыйныя матэрыялы могуць прымяняцца не толькі на прадпрыемствах аб'яднання «Беларусьнафта», але і на іншых прадпрыемствах.

**М. ТВАРДОЎСКІ,**
**начальнік навукова-даследчага сектара ўніверсітэта;**
**М. АКУЛІЧ,**
**старшы выкладчык.**

# СТУДЭНТАМ — ГРАМАДСКІЯ ПРАФЕСІІ

**Павел Уласаў, якога вы бачыце на гэтым здымку, выбраў для сябе прафесію біёлага. Ён ужо заканчвае вучобу і недалёка той час, калі атрымае дыплом аб вышэйшай адукацыі.**

**Пакуль яшчэ нельга сказаць, у якім месцы давядзецца працаваць маладому спецыялісту. Але куды б яго не накіравалі, камсамолец не толькі будзе шчодра дзяліцца набытымі ва ўніверсітэце ведамі, але і радаваць аматараў мастацтва сваім талентам, які ва ўсіх гранях раскрыўся ў тэатры мініяцюр, які працуе на факультэце грамадскіх прафесій ГДУ.**

**Наш фотакарэспандэнт адлюстраваў Паўла Уласава ў ролі «прабіўной» бабулі пры пастаноўцы мініяцюры «Каса на камень».**



Фота А. Рудчанкі.

# ПАДПІСКА ПРАЙШЛА: ЯЕ ВЫНІКІ

Ва ўніверсітэце закончылася падпіска на перыядычныя выданні 1975 года. Гэтае важнае палітычнае мерапрыемства прайшло ў цэлым паспяхова, пры высокай актыўнасці супрацоўнікаў. Усяго сярод іх распаўсюджана 2615 экземпляраў газет і часопісаў — на 437 больш, чым у папярэднім годзе. Гэта вынік добрасумленных і сур'ёзных адносін да важнай справы выкладчыкаў, вучэбна - дапаможнага персаналу і работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Вялікую работу правялі партыйныя арганізацыі, грамадскія распаўсюджвальнікі друку. Значна павялічылася колькасць падпісчыкаў на партыйныя выданні. Асабліва ахвотна іх выпісвалі ў калектывах кафедр грамадскіх навук, фізічнага, эканамічнага механіка-матэматычнага факультэта, АГЧ. У гэтым вялікая заслуга партыйных бюро, грамадскіх распаўсюджвальнікаў друку Валянціны Іванаўны Броўка, Таццяны Мікалаеўны Ленец, Людмілы Аляксандраўны Пановай, Вольгі Васільеўны Іваніцкай, Міхаіла Маркавіча Дворніка.

Аднак на геалагічным, біёлага-глебавым і гісторыка-філалагічным факультэтах падпісная кампанія прайшла не так якасна. Тут не правялі належнай растлумачальнай работы, і асобныя падпісчыкі не афармілі тых выданняў, якія з'яўляюцца найбольш неабходнымі. Партыйным бюро названых факультэтаў варта ўдзяляць больш увагі правядзенню падпіскі на перыядычны друк, каб не дапускаць такіх пралікаў у будучым.

**В. СЕРЫКАЎ,**
**намеснік сакратара парткома па ідэалагічнай рабоце.**

## *Выдатнік: які ён?*

**Сёння ў нас у гасцях — насценная газета «Эканаміст». На наш погляд, яна ўзнімае даволі важныя, актуальныя пытанні. У апошні час у студэнтаў факультэта жывую цікавасць выклікала дыскусія: «Давайце паспрачаемся аб выдатніках». Яна пачалася з выступлення студэнта чацвёртага курса Алега Цімашэнкі, які па просьбе рэдкалегіі «Эканаміста» падзяліўся на адной з калонак газеты сваімі думкамі аб выдатніках.**

**На закранутае пытанне адгукнуўся і ленінскі стыпендыят Аляксандр Сасноў.**

**Першыя выступленні пачатай дыскусіі мы і змяшчаем на старонках універсітэцкай шматтыражкі. Мяркуем, што яны зацікавяць студэнтаў усіх факультэтаў, якіх таксама запрашаем выказаць свае думкі наконт выдатнікаў.**

# НЕ ТОЛЬКІ АДЗНАКА...

...Сам я не двоечнік. Па адзнаках у залікоўцы хутчэй моцны «харашыст». Аднак думку аб выдатніках маю поўную і лічу, што падымаць гэту праблему—справа пустая. А калектыўная думка на гэту тэму нічога не вырашыць, таму што будзе надта агульнай і вельмі суб'ектыўнай. Ды і выдатнікі бываюць розныя: як кажуць, выдатнік выдатніку — розніца. Адны — сапраўдныя, другія — падобныя.

Сапраўдны выдатнік, памойму, той, у каго здольнасці да навук — прызванне, калі можна так сказаць, — «талент ад бога». Згадзіцеся, такіх мала.

Падобныя — тыя, хто вучыцца дзеля пяцёркі. Такая адзнака ў іх — самамэта.

Кажучы шчыра, у выдатнікаў я не веру, таму што не заўсёды дакладна можна вызначыць тых, хто ведае і здае на «пяць» і тых, хто не ведае, але здае на «пяць». І да таго ж — а гэта агульнавядома! — немагчыма роўна ўсё ведаць дастаткова поўна і глыбока (і нават у межах вузаўскай праграмы). Канечне, калі задацца мэтай, дасягнуць можна многага. Але...ўсё роўна далей зубрэння не паедзеш! І, значыцца, «чырвоны» дыплом у гэтым выпадку будзе характарызаваць толькі аднослага выдатнага спецыяліста і зусім не высокаадукаванага чалавека...

Вучыцца на «пяць» могуць усе! Трэба толькі больш або менш вучыць.

Ёсць яшчэ адна катэгорыя выдатнікаў. Калі выдатнік — яшчэ і грамадскі работнік, і актывіст, ён сапраўдны класічны выдатнік! Я — за такіх выдатнікаў!

Яму, бадай, можна прабачыць «пяцёрку не на ўзроўні». Грамадская ж работа, несумненна, патрабуе выключных здольнасцей. І мне думаецца, што іменна актывісты — грамадскія работнікі ўяўляюць сапраўдны твар факультэта, а выдатнікі — толькі яго фон. (Фон, які толькі радуе, а не захапляе. Няхай мяне даруюць).

Чалавек, які заяўляе: «Вучуся і буду вучыцца на «выдатна», і не перашкаджайце» — спажывец. А раз толькі спажывец — значыць, паразіт. І гэта зусім не смешна.

Апраўдаць можна толькі таго, хто ўсвядоміў сабе, што ні на што іншае не здольны і чэсна і шчыра вучыцца на «пяцёрку». А чэсна вучыцца на «пяцёрку», разумеецца, цяжка. Але «грымець» аб гэтым не варта, бо гэта толькі — «свой прыпечак»...

З класічных выдатнікаў факультэта магу з упэўненасцю назваць Борсук-Батурыну Тамару — лідэра прафсаюзнай арганізацыі, выпускніцу (вось бы ўсе выдатнікі былі такімі!); Саснова Аляксандра — камсамольскага важака, пяцікурсніка; Наважылава Вячаслава — былога рэдактара газеты; Трухава Валерыя — цяперашняга аспіранта. З маладзейшых назаву Арцямкова Валодзю, але і ён, наколькі я ведаю, імкнецца стаць «класікам». Ва ўсякім выпадку апошнія падзеі гэта пацвярджаюць.

Вядома ўсім, што галоўная задача студэнта — вучыцца як мага лепш. Я думаю, студэнт павінен і ўсебакова развівацца! І наогул, я за таго студэнта, які вучобе аддае 60—65 працэнтаў сваіх свядомых здольнасцей, а астатнія накіроўвае на пашырэнне свайго кругагляду як разумовага, так і інтэлектуальнага. Такі, я ўпэўнен, не будзе стаяць убаку ад грамадскага жыцця. І карысці ад яго — значна больш. Сумняваецеся? Прыгадайце, хто «робіць надвор'е» на факультэце... Але гэта ўжо іншая размова.

**А. ЦІМАШЭНКА,**
**студэнт групы Т-43**
**эканамічнага факультэта.**

# ЦАНІЦЬ НЕ АГУЛАМ

ПЕРШ за ўсё я не згодзен з прапанаванай Алегам класіфікацыяй выдатнікаў: класічныя выдатнікі, сапраўдныя выдатнікі і падобныя. Калі быць паслядоўным, дык першая і другая групы аб'ядноўваюцца, таму што ў іх шмат агульнага. Але А. Цімашэнка лічыць, што такіх выдатнікаў мала. Значыць, усе астатнія — «падобныя». Аднак, на думку Алега, «падобныя» — гэта тыя, хто вучыцца дзеля пяцёркі. А такіх жа таксама мала: аб гэтым сведчыць той факт, што большасць выдатнікаў на нашым факультэце займаецца грамадскай і навуковай работай.

Куды ж аднесці большую частку выдатнікаў? Па-мойму, класіфікаваць выдатнікаў трэба так, як і ўсіх студэнтаў, г . зн. на актывістаў і неактывістаў, а затым прааналізаваць усе аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны іх грамадскай пасіўнасці або актыўнасці.

Не згодзен я і з тэзісам Алега: «Вучыцца на «пяць» могуць усе! Трэба толькі больш або менш «вучыць». Аб гэтым сведчыць не радасны вопыт большасці студэнтаў, якія хочуць, але не могуць вучыцца на «пяць», нягледзячы на ўсе іх старанні і працу. Аб гэтым сведчыць вопыт і самога Алега, які, выказваючыся яго словамі, «моцны харашыст». Праўда, ён можа не згадзіцца: маўляў, і не хоча вучыцца на «пяць», але гэта будзе проста поза, а не пазіцыя.

Такім чынам, мы падышлі да галоўнага. Неабходна вучыцца і займацца грамадскай работай. Супраць гэтага агульнавядомага тэзіса, я думаю, ніхто не стане пярэчыць. Гэта значыць мы маем дыялектычнае адзінства двух працэсаў — падрыхтоўкі граматнага спецыяліста і выхавання свядомага грамадзяніна нашага грамадства. І таму метафізічнае супрацьпастаўленне аднаго працэса другому не робіць гонару нікому.

У данай сітуацыі Алег выступае яўна з суб'ектыўнай ацэнкай выдатнікаў, з ацэнкай іх пазіцый толькі актывіста — грамадскага работніка. Зразумейце мяне правільна: я лічу, што выдатнік, які не займаецца грамадскай работай, у чымсьці тоесны актывісту — грамадскаму работніку, запусціўшаму сваю работу (а гэтыя факты ў нас маюць месца). Абодва яны абкрадваюць сябе, а заадно і грамадства. Менавіта таму не правільнае сцвярджэнне Алега, што «актывісты — грамадскія работнікі ўяўляюць сапраўдны твар факультэта, выдатнікі — толькі яго фон». І ўжо зусім няправільнае безапеляцыйнае сцвярджэнне, што пасіўны выдатнік — паразіт! Але ж мы (я маю на ўвазе студэнтаў) пакуль яшчэ спажыўцы.

Тут трэба памятаць, што грамадская работа ў сценах ВНУ — гэта падрыхтоўка (або вучоба) да той вялікай грамадскай работы, якая чакае нас на вытворчасці. І тут, як і ў любой вучобе, у чалавека можа аказацца боль або менш здольнасцей, больш або менш жадання і т. п. І калі адзін чалавек змог раскрыць свае грамадскія здольнасці яшчэ да паступлення ў ВНУ, другі — у час вучобы, дык трэці іх зможа адкрыць, стаўшы ўжо спецыялістам. Але чым раней гэта адбудзецца, тым, канечне, лепш. Таму адной з важнейшых задач нашых грамадскіх арганізацый і з'яўляецца тое, каб дапамагчы людзям знайсці сябе, набыць свой твар, свой стыль, свае метады работы.

А наколькі яны правільныя — вызначыць грамадства. І калі гаварыць пра той працэнт «сваіх свядомых (!) здольнасцей», якія неабходна ўдзяляць вучобе і грамадскай рабоце, дык тут не можа быць рэцэптаў, паколькі ўсё залежыць ад канкрэтнай індывідуальнасці чалавека.

Магчыма, я ў чым-небудзь не маю рацыі, таксама мяркую з суб'ектыўных пазіцый выдатніка —грамадскага работніка. Я лічу, таксама, што «надвор'е на факультэце» робіць увесь калектыў, а лідэрамі, у асноўным, з'яўляюцца «выдатнікі» і «моцныя харашысты». Пацвярджэннем гэтаму могуць служыць студэнты, прозвішчы якіх прыводзяцца ў матэрыяле А. Цімашэнкі. Таму я прашу лічыць мае думкі асабістым поглядам на даную праблему.

**А. САСНОЎ,**
**студэнт 5-га курса**
**эканамічнага факультэта,**
**ленінскі стыпендыят.**

СТАРОНКІ СЛАЎНАЙ ГІСТОРЫІ

# ПАРТЫЙНАЕ ПАДПОЛЛЕ Ў МІНСКУ




ДА 30-ГОДДЗЯ вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў сталіцы нашай рэспублікі — Мінску было прысвоена ганаровае званне горад-герой. Слаўную старонку ў летапіс яго гераічнай барацьбы ўпісалі падпольшчыкі. Самаадданая дзейнасць Мінскага падполля — адно з буйнейшых праяўленняў стойкасці і мужнасці савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

1100 дзён і начэй бясстрашныя падпольшчыкі беларускай сталіцы трымалі ў пастаянным страху фашысцкіх акупантаў, для якіх горад ператварыўся ў сапраўдную пастку. У Мінскім падполлі змагалася супраць ворагаў 9155 чалавек. Яны ўчынілі 1304 дыверсіі, вывелі з горада ў лес дзесяць тысяч ваеннапалонных і мінчан, дапамаглі стварыць пяцьдзесят партызанскіх атрадаў і брыгад.

Уся дзейнасць падполля вялася пад кіраўніцтвам камуністаў, гарадскога падпольнага камітэта на чале з Ісаем Казінцом, а пасля яго трагічнай смерці Уладзімірам Амельянюком. Гарком ажыццяўляў сувязь паміж падпольшчыкамі, кіраваў аперацыямі, распаўсюджваннем лістовак і зводак, выдаваў падпольную газету «Звязда», якая запальвала сэрцы тысяч людзей, натхняла іх на барацьбу.

Фашысты збіваліся з ног, спрабавалі выявіць тайную друкарню, за яе выкрыццё абяцалі 75 тысяч рэйхсмарак. А газета друкавалася ў фашысцкім Доме друку, літаральна на вачах у гітлераўцаў. Барыс Пупко і Міхаіл Свірыдаў выконвалі адскую па напружанасці работу, падвяргаліся смяротнай рызыцы. У выданні газеты актыўна ўдзельнічалі М. Воранаў, В. Казачонак, Я. Савіцкая і іншыя падпольшчыкі.

Фашысты неаднаразова наносілі па падполлю жорсткія ўдары. Так, 26 кастрычніка 1941 года было павешана 12 герояў падполля. Пасля раскрыцця рыхтуемага ў Мінску паўстання супраць акупантаў былі схоплены і пакараны 24 кіраўнікі падполля, у тым ліку і сакратар гаркома Ісай Казінец. Яшчэ 25 падпольшчыкаў загінула па даносу правакатара. І гэта далёка не ўсе ахвяры.

Нягледзячы на ўсе пакуты ў фашысцкіх засценках, на штомінутную небяспеку для тых, хто заставаўся на волі, савецкія патрыёты праяўлялі яшчэ нябачную да гэтага сілу духу, да канца жыцця заставаліся вернымі Радзіме, партыі, народу.

Вось што пісаў незадоўга да смерці камуніст-падпольшчык І. Казлоў: «Жыць для Радзімы, для савецкага свабодалюбівага народа, змагацца за гонар і свабоду яго — у гэтым уся прыгажосць жыцця».

Пасля кожнага нанесенага ўдару фашысты святкавалі перамогу, лічачы, што з бальшавікамі пакончана. Але Мінск жыў, Мінск змагаўся і заклікаў да зброі іншых. Падпольшчыкі пранікалі амаль ва ўсе гітлераўскія ўстановы — управу, біржу працы, паліцыю, даведваліся пра важныя разведданыя, дэзарганізоўвалі ўсю праводзімую акупантамі работу.

Найбольш вядомымі падпольшчыкамі Мінска былі Захар Гало і Іван Кабушкін, па клічцы «Жан». Апошні з іх узначальваў у гаркоме аддзел барацьбы з фашысцкай агентурай, прама на вуліцах Мінска асабіста знішчыў больш дваццаці фашыстаў.

Падпольшчыкі правялі мноства важных аперацый. Так, машыніст Ф. Жывёлаў у разгар бітвы пад Масквою вывеў са строю мінскі чыгуначны вузел тэрмінам на дванаццаць дзён. В. Чарнова знішчыла сталоўку афіцэраў авіяштаба. А. Тарлецкі і К. Ваўчок узарвалі электрастанцыю. Камсамольская арганізацыя на чале з М. Кадышкам правяла больш дваццаці аперацый. Сярод белага дня ў Мінску былі забіты бургамістр Іваноўскі, рэдактар фашысцкай газеты Казлоўскі, кіраўнік паліцыі Акінчыц. А ў дні баёў пад Курскам было ўзарвана 150 цягнікоў.

Падпольшчыца А. Мазанік знішчыла ката-садыста, намесніка Гітлера ў Беларусі В. Кубэ. У гэтай смелай аперацыі актыўна ўдзельнічалі Н. Дрозд, М. Осіпава, Н. Траян. Фашысты пісалі, што над немцамі ў Беларусі гняце нейкае праклянцце.

Вось такія старонкі гісторыі Мінскага падполля, якое зрабіла Мінск яшчэ адным сімвалам беспрыкладнага бясстрашша і мужнасці нашага народа. Вось такі лёс людзей, якім мы абавязаны сваім жыццём.

**А. АЙЗЕНШТАДТ,**
**студэнт другога курса гістарычнага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# У ВНУ КРАІНЫ

● Аддзел друку Кішынёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта выдаў карысны дапаможнік «Практыкум па лацінскай мове для студэнтаў гісторыка-філалагічных факультэтаў ВНУ».

У дапаможніку шмат прыкладных сказаў, якія ілюструюць тую ці іншую граматычную з'яву. Пасля кожнага граматычнага раздзела практыкум патрабуе выканання асобных заданняў для замацавання матэрыялу.

**(«Кишиневский университет». КДУ імя У. І. Леніна).**

● Творчыя сувязі паміж калектывамі Беларускага політэхнічнага інстытута і Мінскага аўтамабільнага завода існуюць ужо даўно. Але жыццё патрабуе новых, больш дасканалых форм садружнасці вучоных і работнікаў вытворчасці, накіраваных на хутчэйшае ўкараненне ў вытворчасць дасягненняў навукі і тэхнікі, павышэнне эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паскарэння на гэтай аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу. Менавіта таму і было нядаўна створана навукова-вучэбна-вытворчае аб'яднанне «МАЗ—БПІ».

На сумесным пасяджэнні партыйных камітэтаў Мінскага аўтамабільнага завода і Беларускага політэхнічнага інстытута з удзелам адміністрацыі, вядучых спецыялістаў завода і вучоных інстытута былі абмеркаваны пытанні далейшага ўмацавання творчых сувязей абодвух калектываў.

**(«Советский инженер», БПІ).**

● Па ініцыятыве камітэта салідарнасці Чылі ў політэхнічным інстытуце імя М. І. Калініна ў Ленінградзе быў праведзен нядзельнік, на якім працавала больш за 150 савецкіх і замежных студэнтаў ленінградскх ВНУ. З вялікім уздымам удзельнічалі ў ім інтэрнацыянальныя брыгады. На месцы працы былі развешаны плакаты з патрабаваннямі спыніць тэрор у Чылі, вызваліць палітычных вязняў. Сродкі, зароблены на нядзельніку, пераведзены ў фонд дапамогі патрыётам Чылі. Яны з'яўляюцца ўкладам студэнтаў розных краін у справядлівую барацьбу чылійскага народа за свабоду.

**(«Политехник», ЛПІ імя М. І. Калініна).**

